№38(13079) Чацвер,
17 верасня 2020 г.

**Шчыры носьбіт роднага слова**

Віктар Дайліда мне добра вядомы не толькі як пісьменнік, які любіў і шанаваў сваю Случчыну, свой родны Славінск (ранейшая назва вёска Пуцяты), але і як чалавек, які заўсёды мог даць слушную параду, мог бясконца гаварыць пра родную мову, культуру і традыцыі беларусаў.

Памятаю, як у далёкім дзяцінстве я разам са сваімі бацькамі прыязджаў ў вёску Пуцяты да маці Віктара Браніслававіча Вольгі Кандрацьеўны, дзе штогод ладзіўся фэст на яблычны Спас. Матуля пісьменніка шчыравала каля печы, пякла па сваіх рэцэптах пірагі, а першым, хто выходзіў з хаты быў наш дзядзька і брат Віктар. Прывітаўшыся з бацькамі, ён пяшчотна гладзіў маю галаву і шчыра казаў: "Падрастай, плямеш, любі і шануй сваіх бацькоў, сваю радню, любі роднае слова і, упэўнены, будзеш шчаслівым чалавекам".

Безумоўна, дзядзька Віктар і для мяне, і для маіх блізкіх быў аўтарытэтам, сапраўдным носьбітам беларускай мовы і, канечне, сапраўдным настаўнікам, бо меў за плячыма больш за дваццаць гадоў педагагічнай дзейнасці, працаваў шмат гадоў дырэктарам школ Случчыны. Але больш за ўсё ён успамінаў Чапліцкую сярэднюю школу, дзе быў кіраўніком гэтай установы на працягу дванаццаці гадоў.

І калі надышоў час выбіраць прафесію, я цвёрда вырашыў: буду настаўнікам роднай мовы, хачу ва ўсім быць падобным на нашага пісьменніка (так ужо называлі дзядзьку Віктара мае родныя). Мара мая ажыццявілася, і ўжо сёння, будучы чалавекам сталага ўзросту, маючы больш за трыццаць пяць гадоў педагагічнага стажу, магу шчыра прызнацца, што я шчаслівы чалавек. І ў гэтым немалая заслуга майго дзядзькі Віктара Дайліды.

Кожны год у час летняга адпачынку я бываю ў вёсцы Славінск, наведваю магілы дзядзькі і яго бацькоў. З вёскі Леніна да Славінска іду праз поле пехатой, так я гэта рабіў дзядзька Віктар, з заміраннем сэрца падыходжу да роднай хаты, цяпер ужо нежылой, але такой мілай майму сэрцу…

А вяртаючыся ў Леніна, сустракаючы жыхароў гэтай вёскі, якія на памяць расказваюць урыўкі з твораў Віктара Дайліды (асабліва з яго кніг"Вясна, хлопцы, вясна" і "Пяро дзікай качкі"), упэўніваюся яшчэ і яшчэ раз: багатая ты, Случчына, не толькі на вялікія ўраджаі, але і на такіх слаўных людзей, як Віктар Дайліда.

Репозиторий БГПУ